# ЗАКЛЮЧЭННЕ

Архітэктура Заходняй Беларусі прайшла няпростую і цікавую эвалюцыю з 1915 па 1940 г., ва ўмовах несавецкага дзяржаўнага ладу. Тым больш цікавым і каштоўным падаецца нам традыцыя культавай архітэктуры, што пратрывала на нашых землях да сярэдзіны XX ст.

Шматлікія храмы, што былі запраектаваныя яшчэ напярэдадні Першай сусветнай вайны і дабудоўваліся ва ўмовах нямецкай акупацыі, мелі відавочна рэтраспектыўны характар, пераважна неагатычны. Перыяд першай нямецкай акупацыі характарызаваўся адменаю шматлікіх бюракратычных бар'ераў для неправаслаўных рэлігійных суполак і, адпаведна, усплёскам храмавага будаўніцтва. Аднак ва ўмовах вайны і гаспадарчага крызісу яны вызначаліся даволі сціплымі памерамі і таннасцю матэрыялаў.

У выніку кампаніі рэвіндыкацыі ў праваслаўнай царквы былі аднятыя шматлікія храмы, што некалі належалі каталіцкай царкве (усходняга і рымскага абрадаў) і вернутыя першаўласнікам. З аднаго боку, гэта прывяло да часовага крызісу ў рэлігійным жыцці, а з іншага – стымулявала новае царкоўнае будаўніцтва праваслаўнай канфесіі.

Напрыканцы 1920-х гг. у сакральным дойлідстве імкліва пачаў ствараецца нацыянальны стыль у рэчышчы нацыянальнага рамантызму. Вялікая заслуга ў стварэнні ўласна беларускага нацыянальнага стылю належыць Льву Вітану-Дубейкаўскаму.

Крыніцамі пошукаў нацыянальных рамантыстаў была цікавасць да неабарока, што стала вельмі папулярным і ў цывільным, дзяржаўным будаўніцтве, імпарт прыёмаў гэтак званых закапанскага, татранскага, старапольскага стыляў, што ўжо склаліся ў Паўднёва-Усходняй Польшчы і на Галіцыі перад Першай сусветнай вайной. Прыблізна адначасова з пошукамі палякаў і ўкраінцаў была запачаткаваная і беларуская тэорыя нацыянальнага стылю ў драўляным будаўніцтве. Яе пачынальнікам

стаў Леў Вітан-Дубейкаўскі, які з'яўляецца аўтарам спецыяльнай работы «Эвалюцыя і рэформа дзераўлянага будоўніцтва».

З 1930-х гг. малапамернае культавае будаўніцтва рымска-каталіцкай царквы, пры дзяржаўнай падтрымцы, пераважна драўлянае, набыло масавы характар. Стылістычна будынкі гэтай пары характарызуюцца ўмоўна-рэтраспектыўнымі рысамі, з вялікім уплывам традыцыйных мясцовых будаўнічых прыёмаў.

Пэўнае развіццё ў 1930-я гг. у Заходняй Беларусі атрымаў і неакласіцызм. Гэтак, Свята-Пакроўскі сабор у Баранавічах стаў самым адметным збудаваннем у гэтым кірунку ў даваеннай Беларусі.

Напрыканцы 1930-х гг. паўсталі храмы ў мадэрнізацыйным духу тагачаснага канструктывізму. Новыя тэхналагічныя прыёмы і матэрыяльныя магчымасці дазволілі ствараць іншыя, нетрадыцыйныя вобразы храмавых будынкаў.

Уз'яднанне Усходняй і Заходняй Беларусі ўзнавіла «рэлігійнае пытанне», бо ў Заходняй Беларусі да 1939 г. дзейнічала 446 касцёлаў, 542 царквы, 387 сінагог, 14 манастыроў. Святарскую паслугу выконвала 617 каталіцкіх, 606 праваслаўных святароў, 293 рабіны. Да 1939 г. у СССР налічвалася 50 тыс. каталікоў, пасля далучэння – 6,5 млн. Савецкая ўлада, адкрыта прапагандуючы атэізм, распачала бязлітаснае змаганне з вернікамі і клірам. Ужо да вайны новая ўлада адразу пачала з арышту святароў і закрыцця храмаў. Але ажыццявіць задуманае не паспелі: пачалася вайна. Масавы пасляваенны тэрор у адносінах да жыхароў Заходняй Беларусі, татальнае знішчэнне культавых цэнтраў, эміграцыя альбо фізічнае знішчэнне ўсёй даваеннай інтэлігенцыі нанеслі невяртальны ўрон беларускай культуры. На жаль, большасць храмаў 1920–1930 гг. да нас не дайшло, многія моцна перабудаваныя і прыстасаваныя да іншых мэтаў. Да гэтага неабходна дапоўніць, што немагчыма цяпер знайсці і архіўных матэрыялаў таго часу. Частка архіваў прапала ўжо ў 1939 г. пры імкненні іх эвакуяваць, пазней не звярталася ўвага на іх патэнцыянальную каштоўнасць, і аб іх захаванні ніхто не клапаціўся. Пасля Другой сусветнай вайны новая культавая архітэктура ў Беларусі як адзін з тыпаў сучаснага будаўніцтва перастала існаваць увогуле да 1991 г.